# Гомельскі універсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 34 (821) | Чацвер, 19 снежня 1991 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.

**12 снежня г. г. у зале пасяджэнняў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь адбылася нарада рэктараў беларускіх ВНУ, якая была склікана па іх жа ініцыятыве. Нараду па пытаннях рэалізацыі нядаўна прынятага Вярхоўным Саветам Закона «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» вёў намеснік Старшыні СМ РБ М. І. Дзямчук.**

**У прынцыпова важнай дыскусіі прыняў удзел і рэктар нашага універсітэта Л. А. Шамяткоў, выступленне якога прапануем увазе чытачоў.**

# НОВАМУ ЗАКОНУ — ЖЫЦЦЯДЗЕЙСНУЮ АСНОВУ

Прыняцце Закона «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» з'явілася вялікай падзеяй апошняга часу. Закон вельмі добры, прагрэсіўны, можа сапраўды стаць асновай для адраджэння нацыянальнай сістэмы адукацыі. Разам з тым выкананне Закона будзе пад пагрозай, калі з самага пачатку не вырашыць пытанне аб прынцыпах. Я маю на ўвазе прынцыпы ўзаемадзеяння ўрада з Міністэрствам адукацыі, а таксама прынцыпы ўзаемадзеяння Міністэрства адукацыі з навучальнымі ўстановамі. Я хацеў бы выказаць некаторыя канкрэтныя прапановы.

Перш за ўсё скажу аб фінансаванні адукацыі. Патрабаванні педагагічнай грамадскасці звычайна датычаць павышэння зарплаты, павелічэння стыпендый. Канешне, гэта зараз вельмі важна і неабходна, і я поўнасцю падтрымліваю рэзалюцыю рэспубліканскай нарады прафсаюзнага актыву і прадстаўнікоў забастовачнага руху ў арганізацыях адукацыі, якая апублікавана ў «Настаўніцкай газеце» 7 снежня. Аднак зусім незразумела, чаму, як вынікае з гэтай публікацыі, Дзяржкамітэт па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва плануе размясціць педагогаў у другой групе галін па аплаце працы (з 7 па 12 месца пры схеме з 22 разрадаў па зарплаце). У развітых краінах сярэдняя зарплата ў адукацыі хоць крыху, але ўсё ж вышэй сярэдняй зарплаты ў прамысловасці. І ў нашым Законе ёсць артыкул, які вызначае суадносіны паміж зарплатай педагагічных работнікаў і ў прамысловасці. Значыць, дзейнічаючы ў рамках прынятага Закона аб адукацыі, урад павінен устанавіць гэтыя суадносіны і прадаставіць права Міністэрству адукацыі самому ўстанаўліваць зарплату педагогам. Выконваючы Закон, урад павінен штогод пераглядаць гэтыя суадносіны ў бок павелічэння. Пры гэтым павінна быць улічана асабліва становішча ВНУ Гомельскай і Магілёўскай абласцей, якія пацярпелі ад чарнобыльскай аварыі.

Размова ідзе, калі хочаце, аб надзяленні Міністэрства адукацыі надзвычайнымі паўнамоцтвамі. Але і час надзвычайны. На нашу бяду, дробны бізнес (а буйнага ў нас няма, толькі буйная спекуляцыя) дзейнічае бескантрольна і не толькі пераманьвае кваліфікаваныя кадры, але і проста разлагае ВНУ. У ВНУ ствараюцца малыя прадпрыемствы, якія, як ракавая пухліна, грызуць вышэйшую школу знутры. Зразумейце, я не супраць бізнесу, але тое, што цяпер адбываецца, — гэта ад галечы, якая забівае ўсё жывое. Вось прыклад. Прыходзіць да мяне загадчык кафедры і кажа: мы хочам стварыць малое прадпрыемства. Яно будзе мець 7 заснавальнікаў: універсітэт і 6 членаў кафедры. Даходы дзеляцца на 7. Кожны член кафедры і універсітэт будуць атрымліваць 1/7 даходу. У той жа час гэта малое прадпрыемства будзе працаваць на плошчах і абсталяванні універсітэта, выкарыстоўваць распрацоўкі, атрыманыя ва універсітэце. Гэта грабёж сярод белага дня. Калі гэта не спыніць, ВНУ будуць разрабаваны і разбэшчаны неўтаймаваным імкненнем рабіць грошы.

Хто павінен гэта спыніць? Канешне, урад. Неабходна, каб і ўрад, і грамадства ў цэлым разумелі, што бескантрольнае развіццё прадпрымальніцтва прыводзіць да бескантрольнай спекуляцыі і адсутнасці тавараў. С. С. Шушкевіч у інтэрв'ю «Народнай газеце» фактычна гэта прызнаў. Гэта «дзікі» капіталізм, з якім на Захадзе даўно пакончана. Паглядзіце, напрыклад, на Амерыку: там дзейнічаюць законы, якія абмяжоўваюць прадпрымальніцкую дзейнасць нават прэзідэнта. Калі мы ўжо ўзяліся будаваць капіталізм, то давайце будаваць цывілізаваны капіталізм, той, які абмяжоўвае спекуляцыю і заахвочвае вытворцаў. А вышэйшая школа належыць да вытворцаў самага высокага класа, таму што яна вытварае самае каштоўнае — веды. Заахвочваць і дастойна фінансаваць вышэйшую школу — гэта павінна быць клопатам і ўрада, і самага апошняга бізнесмена, а калі гэтыя бізнесмены не хочуць — то іх трэба прымусіць гэта рабіць.

Нельга чакаць 1 студзеня 1994 года, а ўжо з 1992 неабходна пачаць павелічэнне дзяржаўнага фінансавання адукацыі з тым, каб паступова да 94 года дасягнуць 10% ад нацыянальнага даходу, як гэта прадугледжана Законам.

І апошняе — аб правах ВНУ. Вышэйшыя навучальныя ўстановы цяпер поўнасцю бяспраўныя, таму што акрамя Закона аб адукацыі ніякіх нарматыўных дакументаў няма. Фактычна ствараецца новае міністэрства — Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. І вельмі важна ўсвядоміць, што сляпое капіраванне бюракратычных структур Дзяржкамітэта прывядзе ў тупік. Прынцып тут павінен быць такі: ураду неабходна надаць Міністэрству максімальна больш правоў, а Міністэрства павінна забяспечыць значна большыя правы навучальным установам у іх вучэбна-гаспадарчай дзейнасці. Гэта датычыць таксама і прысваення вучоных ступеняў і званняў.

Пазаўчора на сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь было прынята рашэнне аб перадачы маёмасці КПБ народу і, у прыватнасці, маёмасці былога ЦК КПБ — адукацыі, культуры і ахове задроўя. У сувязі з гэтым паўстае пытанне аб перадачы выдавецтва ЦК КПБ у падпарадкаванне Міністэрству адукацыі.

Як вядома, створанае некалькі гадоў назад выдавецтва «Універсітэцкае» не мае неабходнай паліграфічнай базы і вымушана дзеля існавання выпускаць штогод 3—4 папулярныя кнігі. Пры гэтым страчваецца каля 98% паперы. А за падручнікі, манаграфіі вучоных універсітэтаў неабходна плаціць самім, самім жа здабываць паперу. У той жа час выдавецтва «Навука і тэхніка», напрамую падпарадкоўваючыся Акадэміі навук, мае добрую базу і магчымасць выдаваць неабходную літаратуру.

Таму я ўношу прапанову: аб'яднаць выдавецтвы «Вышэйшая школа», «Народная асвета» і «Універсітэцкае» ў адно, падпарадкаваць яго непасрэдна Міністэрству адукацыі і перадаць яму паліграфічную базу былога ЦК КПБ. Пры гэтай умове Міністэрства адукацыі зможа каардынаваць і арганізаваць выпуск падручнікаў, дапаможнікаў на беларускай мове, двухмоўных слоўнікаў, неабходных для выканання Законаў «Аб мовах у Беларускай ССР» і «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь». Гасцініцу «Кастрычніцкая» ў Мінску таксама трэба перадаць Міністэрству адукацыі. Тое ж самае трэба зрабіць і ў абласных цэнтрах.

## НА АЗДАРАЎЛЕННЕ

У красавіку бягучага года на вучоным савеце універсітэта было прынята рашэнне аб выплаце грашовай кампенсацыі выкладчыкам і супрацоўнікам ГДУ, якія не атрымаюць прафсаюзныя пуцёўкі для аздараўлення.

Гэта рашэнне выканана. На мінулым тыдні бухгалтэрыяй праводзілася выплата адначасовай матэрыяльнай дапамогі з фонду эканоміі заработнай платы за 1990 год, каштарысў расходаў на 1991 г., а таксама фондаў матэрыяльнага заахвочвання НДС і ПНДЛ. Выкладчыкі і супрацоўнікі (у тым ліку штатныя работнікі НДС), якія не забяспечваліся пуцёўкамі на аздараўленне, атрымалі грашовую дапамогу ў памеры 290 рублёў кожны. Тым жа, хто ў час адпачынку папраўляў і ўмацоўваў сваё здароўе ў санаторыях, дамах адпачынку, на турбазах па пуцёўках за кошт прафсаюзных сродкаў і з'эканомленых сродкаў па іншых артыкулах расходаў за 1990 год, выплачана адначасовая матэрыяльная дапамога ў памеры 130 руб. кожнаму.

## АБМЯРКУЕ САВЕТ УНІВЕРСІТЭТА

Сёння ў 15 гадзін у аўдыторыі 2—26 вучэбнага корпуса № 5 пачнецца пасяджэнне Савета універсітэта. Першым па парадку дня будуць абмеркаваны вынікі работы універсітэта ў папярэднім навучальным годзе і задачы на 1991—92 навучальны год. З дакладамі выступяць рэктар, прарэктары, галоўны бухгалтар.

Затым на Савеце адбудзецца абмеркаванне Закона «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь».

Савет зацвердзіць змяненні ў Статуце Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны.

*У ВНУ краіны*

## Вышэйшы орган — Асамблея

Згодна праекта Статута Адэскага універсітэта, вышэйшы орган ВНУ будзе называцца Асамблеяй АДУ, у якую ўваходзіць вучоны савет (не больш 50% членаў Асамблеі). Асамблея выбіраецца на пяць гадоў па квотнаму прынцыпу: навукова-педагагічных работнікаў — 70 працэнтаў, студэнтаў — 15 працэнтаў, аспірантаў — 5 працэнтаў, астатніх катэгорый — 10 працэнтаў, і збіраецца не радзей двух разоў у год (або па ініцыятыве рэктара, вучонага савета або 20 працэнтаў членаў Асамблеі).

## У ПРАФКОМЕ

Адбылося чарговае пасяджэнне прафсаюзнага камітэта універсітэта. Адным з яго пытанняў была падрыхтоўка да Новага года — камплектаванне святочных падарункаў для дзяцей выкладчыкаў і супрацоўнікаў, арганізацыя і правядзенне навагодняга ранішніка. На прафкоме выступіла таксама дацэнт кафедры этыкі, эстэтыкі і гісторыі культуры Т. П. Гараніна. Выкладчыкі гэтай кафедры ў межах курса па этыцы вядуць са студэнтамі — будучымі педагогамі вялікую работу па аказанню дабрачыннай дапамогі дзецям-інвалідам, сіратам, тым, хто знаходзіцца на лячэнні ў гематалагічным аддзяленні абласной бальніцы і інш. Яны збіраюць і перадаюць для іх цацкі, кніжкі, іншыя падарункі. Цяпер, перад святам Новага года, гэтая акцыя міласэрнасці актывізуецца. Т. П. Гараніна звярнулася да членаў прафкома з просьбай: паведаміць на факультэтах, у структурных падраздзяленнях аб праводзімай у гэтым напрамку рабоце і аказаць па меры сіл садзеянне ў зборы для дзяцей, абдзеленых лёсам, цацак, кніжак і г. д., каб прынесці малышам радасць. У сваю чаргу прафком прыняў рашэнне выдзеліць для гэтых дабрачынных мэт 200 рублёў грашовай дапамогі.

Абмяркоўвалася пытанне і аб пераразмеркаванні гуманітарнай дапамогі, якая паступіла ва універсітэт у мінулым месяцы ад Еўрапейскага супольніцтва. Члены прафкома былі ў сваім рашэнні аднадушныя: да раней атрыманых 12 слоікаў мясных кансерваў дадаткова выдзеліць іх шматдзетным сем'ям, маці-адзіночкам, студэнтам-сіратам, а таксама для навагодніх падарункаў дзецям.

Разгледжана арганізацыйнае пытанне. У сувязі з тым, што У. А. Пенязь выйшаў з саставу прафкома па стану здароўя, першым намеснікам старшыні прафсаюзнага камітэта Г. І. Варатніцкага выбрана Г. М. Гадлеўская.

